

# “Свята вады”, або Рытуальнае выкарыстанне вады на працягу года



**Абапіраючыся на шматлікія фальклорна-этнаграфічныя крыніцы, архіўныя матэрыялы, уласныя запісы, зробленыя падчас экспедыцыйных паездак, мы паспрабуем сістэматызаваць звесткі аб выкарыстанні святой, цудадзейнай, “жывой” вады ў каляндарным колазвароце нашага жыцця, падаць іх у храналагічнай паслядоўнасці са спадзяваннем на тое, што духоўна-аздараўленчы вопыт нашых продкаў хоць у нейкай ступені дапаможа людзям знайсці палёгку целу і душы.**

### 25 снежня або 7 студзеня — першы дзень Калядаў: Посная куцця, Раство Хрыстова

— Яшчэ на досвітку гаспадар прыносіў у хату свежую ваду. У драўляныя ночвы апускалі дробную сярэбраную манету, налівалі ваду. Спачатку “пасярэбранай” вадой мыў твар сам гаспадар, а за ім усе дамачадцы. Людзі верылі, што такі рытуал “забяспечыць” на цэлы год здароўе і чысціню твару.

### 1 або 14 студзеня — Каляды: Другая куцця, Новы або Стары Новы год

— Лічылася: хто ў першы дзень Новага года першым прынясе вады з калодзежа і першым памыецца, той увесь год па жыцці будзе першым.

— Падчас навагодняга ўмывання ў ваду трэба пакласці медныя або залатыя грошы (або ўпрыгажэнні), каб на працягу года быць прыгожым і здаровым, а сярэбраныя рэчы — каб мець чысты белы твар.

### 18 студзеня — Каляды: Трэцяя куцця, пярэдадзень Вадохрышча

— У некаторых сем’ях у гэты дзень увогуле нічога не елі, толькі пілі ваду. Часцей за ўсё гэта былі сем’і пчаляроў, сярод якіх бытавала павер’е: калі ў гэты дзень устрымацца ад ежы, то добра будуць раіцца пчолы.

### 19 студзеня — Вадохрышча, Богаяўленне

— Самай шанаванай, выключнай па сваім аздараўленчым статусе лічылася вада, узятая ў гэты дзень. Яе абавязкова прыносілі ў хату, крапілі ўсе куты, сцены, умываліся ёю, пілі, каб быць здаровымі і “ачысціцца” ад усялякіх грахоў.

— Яе бралі як мага больш, каб хапіла карыстацца на працягу года ў самых розных сітуацыях.

— У дзень Вадохрышча з хаты ні з якой нагоды не дазвалялася выносіць ваду і аддаваць яе чужым людзям. А для свойскай жывёлы ваду рыхтавалі загадзя.



**20 студзеня — Провады Калядаў, Правадохрышча, Сабор Іаана Прадцечы**

— У гэты дзень у цэрквах адбывалася малое асвячэнне вады ў гонар Іаана Прадцечы.

— Яшчэ адна назва гэтага дня — “лянівы дзень”, таму што на працягу дня не працавалі, а перад ядой абавязкова пілі асвячоную ў храме ваду.

**15 лютага — Грамніцы, Стрэчанне Гасподняе**

— Акрамя грамнічных свечак у гэты дзень у храмах асвячалі ваду, якая набывала незвычайныя здольнасці лячыць “вогнік”, рожыстае запаленне рук і ног, а таксама апёкі і чырвоныя плямы на целе дзяцей пасля так званага “мацярынскага пужання”.

**7 красавіка — Дабравешчанне**

— Прасфору і ваду, узятую ў гэты дзень ў царкве, таксама захоўвалі і выкарыстоўвалі для лячэння розных хвароб, асабліва пры захворванні вачэй і для першага купання дзяцей.

**Вербная нядзеля (нядзеля перад Вялікаднем), Уваход Гасподні ў Іерусалім**

— Калі ў чалавека пастаянна балела галава, раілі зрабіць так: у вербную нядзелю начасаць валасоў, кінуць у ваду, і гэтай вадой паліваць вярбу, пры гэтым казаць: “Ехаў пан, вёз жбан, жбан пабіўся, вада палілася, і ў (імя хворага чалавека) у галаве боль сунялася”.

**Белы або Страсны тыдзень (апошні тыдзень перад Вялікаднем): Чысты чацвер**

— Існавала павер’е, што чалавек, які на досвітку ў чацвер пакупаецца ў рэчцы, возеры ці памыецца ў лазні, змые з сябе грахі і засцеражэцца ад розных хвароб на цэлы год.

— У ноч з серады на чацвер на адкрытае месца ставілі “пад зоры” соль і ваду. Раніцай чацвярговай вадой “змывалі” ўсе хваробы і няўдачы, жыццёвыя непаразуменні. Старыя людзі раілі спачатку выпіць некалькі глыткоў асвячонай зорамі вады, а потым памыцца ёю.

— Калі чалавека сурочылі, “папрáвіць” сітуацыю можна было ў Чысты чацвер. Трэба было на досвітку памыцца крынічнай вадой або той, якую ставілі пад “зоры”, і сказаць: “Як гэта матушка-вадзіца бяжала без пятна, без паваротна і ўмывала крутыя берага, так штобы ва ў рабы Божай (імя) не было ні злых урокаў, ні агавораў, ні перагавораў ні ў белым целе, ні ў цёмным, ні ў светлых бравях, ні ў касцях. Амін”.



— Калі дзяўчына не магла выйсці замуж, ёй раілі ў Чысты чацвер памыцца і выцерціся ручніком, а на Вялікдзень аддаць яго тым, хто просіць міласціну, разам з фарбаваным яйкам і пасхай.

— Каб павялічыць малочнасць кароў, у Чысты чацвер на світанні з крыніцы ў хату прыносілі два вядры, да краю напоўненыя вадой, пры гэтым гаварылі так: “Як гэта вада прыбывае, так і малако каб прыбывала ў маёй каровы”.

**Чырвоная субота (апошняя перад Вялікаднем)**

— У гэты дзень у храмах адбываецца малое асвячэнне вады, а ў другой палавіне дня асвячаецца рытуальная ежа, з якой пачнецца першы святочны дзень пасля заканчэння Вялікага посту.

**Вялікдзень — Пасха**

— Раніцай уся сям’я збіралася вакол посуду з вадой і апушчаным у яе асвячоным чырвоным яйкам. Пачынаючы з самага малодшага, кожны з членаў сям’і падыходзіў, тройчы апускаў рукі ў ваду і тройчы праводзіў імі па твары, каб твар быў “прыгожанькім”, “чырвоненькім” і “кругленькім”.

— Знаўцы народнай медыцыны раілі: каб зрок быў добрым, трэба было перад абразамі ў чырвоным куце працерці той вадой вочы і сказаць так: “Как люди на икону глядят, так бы и мои глаза век по веку хорошо глядели. Аминь.”

**6 мая — Юр’е**

— Вадой, узятай з ручая на ўзыходзе сонца гэтага дня, крапілі вуллі, каб мёд быў смачным, а пчолы гулі, як вада ў ручаі.

— Юраўскай расой, якую збіралі на досвітку ручніком, лячылі бясплоднасць.

**15 мая — дзень Барыса і Глеба**

— Пасля царкоўнага набажэнства ў храмах абавязкова хадзілі да крыніц, якія не замярзалі зімой. Вада гэтага дня ў іх лічылася гаючай, асабліва для тых, хто хварэў на вочы.

**22 мая — Мікола Веснавы**

— Гэты дзень у народзе лічыўся пачаткам купання. Таму неабходна было выканаць адпаведны рытуал: раніцай усёй вёскай людзі ішлі да крыніцы або калодзежа, маліліся, пілі “жывую” ваду, крапілі адно аднаго, каб на працягу года быць моцным і здаровым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




**Прапалавінне (серада на чацвёртым тыдні пасля Вялікадня)**

— У гэты дзень царква моліцца “аб напаенні ўсіх хвараючых водамі блачэсця”. Напрыканцы набажэнства заўсёды праводзіцца малое асвячэнне вады.

— З гэтага дня і да Іллі дазвалялася купацца.

**Узнясенне (саракавы дзень пасля Вялікадня)**

— У гэты дзень трэба было абавязкова схадзіць да крыніцы: памыцца, выпіць гаючай вады, узяць з сабой для далейшага карыстання. Існавала таксама незвычайная традыцыя: калі ўстаць на ўзыходзе сонца, украсці з чужога падворка гаршчок, збан або глечык, прыйсці да крыніцы і з яго выпіць ваду, то жаданне абавязкова збудзецца.

— Лічылася, што вада гэтага дня валодае незвычайнымі якасцямі і можа дапамагчы ў лячэнні бясплоднасці.

— Паміж Узнясеннем і Тройцай забаранялася ткаць, вязаць. Лічылі, што можна “заткаць ваду” — такі неабходны ў гэты час дождж.

**Русальны тыдзень (восьмы пасля Вялікадня, першы пасля Тройцы)**

— Беларусы верылі, што ў гэтыя дні русалкі выходзяць з вады і могуць нашкодзіць чалавеку: заманіць маладых хлопцаў у сваё падводнае царства. Менавіта таму ўвесь гэты тыдзень дзяцей не пускалі гуляць каля адкрытых вадаёмаў, а дарослым забаранялася купацца.

— У той жа час трэба было раніцай абавязкова схадзіць да крыніцы або калодзежа і набраць вады, якая, на думку многіх знахараў, была асабліва карысная і гаючай.

**Дзявятухна і Дзясятухна (дзявяты і дзясяты тыдні пасля Вялікадня)**

— Гаючай лічылі ваду ў чацвер на дзявятым і дзясятым тыднях пасля Вялікадня. У гэтыя дні сяляне абавязкова ішлі да крыніц, каб папіць і ўзяць вады з сабой.

**6 ліпеня — Купалле**

— Увечары каля ракі або возера палілі вогнішча, чакалі раніцы (ноччу купацца забаранялася!), каб на досвітку ўбачыць, як Сонца “купалася” ў вадзе. І пасля таго, як ваду асвяціла нябеснае свяціла, усе таксама акуналіся, каб ад Сонца праз ваду набрацца моцы і здароўя на ўвесь год.

— Там, дзе не было вадаёмаў, у гэты дзень ставілі ваду пад “зоры”, каб раніцай памыцца і тым самым засцерагчыся ад сурокаў.



**7 ліпеня — Іван Купала або Раство Іаана Хрысціцеля**

— Пасля сустрэчы “іграючага” Сонца і купання ў асвячонай такім чынам вадзе людзі ішлі да свяшчэнных крыніц, каб папіць іх вады з надзеяй папраўіць сваё здароўе.

**12 ліпеня — Пятрок**

— У гэты дзень хадзілі да крыніц, каб папіць гаючай вільгаці, а затым трэба было “пакачацца” па ранішняй расе.

— Катэгарычна забаранялася купацца. У нашым народзе свята верылі, што вада на Пятра забірае ахвяру Богу: “Сож бярэ дваццаць пяць чалавек у дзень Пятра, увесь Месяц — на жэрству Богу”.

— У некаторых рэгіёнах лічылі, што толькі “пятрова вада” змывае грахі сямейнай здрады, таму гэтыя людзі купаліся ў асобных вадаёмах.

**2 жніўня — Ілля Грамавержац**

— Паўсюдна лічылі, што пасля Іллі лепш не купацца ў рацэ — можна цяжка захварэць. Гэта выснова грунтуецца на архаічных уяўленнях аб тым, што ўсю зіму нячыстая сіла жыве ў вадзе, а на перыяд з Вадохрышча і да Іллі яна пераходзіць на вярбу або іншыя дрэвы. І пасля Іллі яна зноў вяртаецца ў ваду.

— Калі ў дзень Іллі будзе навальніца з дажджом, то жанчыны збіралі гэту ваду і мыліся ёю або імкнуліся абліцца з ног да галавы, бо лічылася, што яна пазбаўляе чалавека ад сурокаў.

— На Іллю ў храмах асвячалі ваду, а затым лілі ў свой калодзеж, каб яна не псавалася.

**14 жніўня — Спас мядовы, Макавей або Спас на вадзе**

— У гэты дзень выконвалася малое асвячэнне вады, рабілі таксама “Хрэсны ход на ваду”. Пасля асвячэння людзі абавязкова акуналіся ў раку, возера.

— Не прапускалі гэты дзень і пастухі. Яны імкнуліся апошні раз загнаць у “святую купель” увесь статак.

— Каб на працягу года вада ў калодзежы была чыстай, у гэты дзень каля яго чыталі малітвы і лілі крыху свянцонай вады.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ